Трэцяя Сесія Вярхоўнага Совета СССР 1-га склікання

ПАСЯДЖЭННЕ СОВЕТА САЮЗА 28 МАЯ 1939 ГОДА

СПРЭЧКІ ПА ДАКЛАДУ АБ ДЗЯРЖАЎНЫМ БЮДЖЭЦЕ СССР НА 1939 ГОД

Прамова дэпутата НАТАЛЕВІЧА Н. Я.

Таварышы дэпутаты! Совет Народных Камісараў прадставіў на разгляд і зацвярджэнне Трэцяй Сесіі Вярхоўнага Совета СССР дзяржаўны бюджэт Саюза ССР на 1939 г. і справаздачу аб выкананні бюджэта за 1937 год.

Дзяржаўны бюджэт Саюза ССР на 1939 г. па даходах складае 155.607 млн. руб. і па расходах 154.957 млн. руб., з перавышэннем даходаў над расходамі ў 650 млн. руб. Бюджэт поўнасцю адказвае палітычным і эканамічным задачам трэцяй пяцігодкі, якія паставіў перад намі вялікі Сталін на XVIII з'ездзе ВКП(б), поўнасцю адлюстроўвае ленінска-сталінскую нацыянальную палітыку нашай партыі. Таму я падтрымліваю прапанову ўжо выступаўшых дэпутатаў аб зацвярджэнні дзяржаўнага бюджэта на 1939 год і справаздачы аб выкананні дзяржаўнага бюджэта за 1937 год з улікам паправак, унесеных Бюджэтнай Камісіяй Совета Саюза.

У дзяржаўным бюджэце на 1939 г., як у люстры, паказаны найвялікшыя соцыялістычныя перамогі, дасягнутыя совецкім народам у рэзультаце паспяховага выканання сталінскіх пяцігодак, пад кіраўніцтвам нашай слаўнай непераможнай партыі Леніна — Сталіна і правадыра народаў—нашага мудрага настаўніка таварыша Сталіна. **(Апладысменты).**

Цыфры бюджэта гавораць аб няўхільным, магутным тэмпе нашага руху ўперад да комунізма, яны з'яўляюцца жывым выкрывальнікам негрунтоўнасці і гніласці капіталістычнай сістэмы і яркім паказальнікам перавагі соцыялістычнай сістэмы над капіталістычнай, паказальнікам несакрушымай сілы і магутнасці нашай соцыялістычнай дзяржавы.

Запраектаваны рост даходаў у параўнанні з 1938 г. на 28.036 млн. руб. паказвае выключныя магчымасці нашай соцыялістычнай радзімы. Нямала знойдзецца такіх капіталістычных дзяржаў, якія ў гэтую суму ўкладуць свае бюджэты 10, а то і больш разоў.

Велізарны і няўхільны рост нашага дзяржаўнага бюджэта азначае, што мы стаім на верным шляху ў ажыццяўленні гістарычнай задачы, пастаўленай вялікім Сталіным перад партыяй і ўсім совецкім народам, задачы — дагнаць і перагнаць у эканамічных адносінах галоўныя капіталістычныя краіны на працягу бліжэйшых 10—15 год.

Калі падрыхтоўка новых і фінансаванне імперыялістычных войн, якія ўжо вядуцца, паглынаюць ільвіную долю бюджэтаў капіталістычных краін, калі гэтыя бюджэты па сутнасці ператварыліся ў ваенныя бюджэты з велізарнымі дэфіцытамі, — то наш дзяржаўны бюджэт расце і павялічваецца, прычым такімі тэмпамі, якіх капіталістычныя краіны не ведалі і ў самыя лепшыя годы

У справе ажыццяўлення найвялікшай гістарычнай задачы — дагнаць і перагнаць галоўныя капіталістычныя краіны і ў эканамічных адносінах — наш совецкі рубель адыграе сваю ролю і пакажа сябе таксама бліскуча, як ён паказаў сябе ў ажыццяўленні першых двух сталінскіх пяцігодак. Наконт таго, што ў гэтым спаборніцтве двух сістэм — соцыялізма і капіталізма — наш рубель выйдзе пераможцам, ніхто не сумняваецца. Зарукай гэтага — наша соцыялістычная сістэма, воля да барацьбы, да перамогі нашага вялікага герайчнага народа, які неадступна ідзе ўперад пад мудрым кіраўніцтвам нашай партыі і вялікага правадыра народаў, любімага настаўніка таварыша Сталіна. **(Апладысменты).**

Назначэнне бюджэта нашай соцыялістычнай дзяржавы дыяметральна процілегла назначэнню і мэтам бюджэтаў капіталістычных краін. Бюджэты капіталістычных краін адлюстроўваюць інтарэсы кучкі капіталістаў і эксплаататараў. Назначэнне бюджэтаў капіталістычных краін — гэта ахова буржуазнага ладу, ладу эксплаатацыі працоўных мас, гэта падрыхтоўка і вядзенне новых войн у інтарэсах паноў-капіталістаў. Вось чаму буржуазныя дзяржаўныя дзеячы старанна скрываюць ад працоўных назначэнне сваіх бюджэтаў. Павелічэнне той ці іншай стацьі даходаў бюджэтаў капіталістычных дзяржаў азначае немінучае ўзмацненне эксплаатацыі працоўных, пагоршанне іх матэрыяльнага і бытавога становішча.

Германскія фашысты з года ў год павялічваюць расходы на вайну. Увесь цяжар гэтых расходаў кладзецца на плечы працоўных. Фашысты ўжо даўно пасадзілі насельніцтва на галодны паёк. Лозунг «гарматы замест масла» ператварыўся ў лозунг «гарматы замест хлеба». Насельніцтва Германіі атрымлівае не больш 60 проц. той колькасці хлеба, якую яно атрымлівала ў мінулым годзе.

Японскі ўрад намагаецца, каб здашукаць сродкі для вядзення вайны ў Кітаі. Бюджэтныя асігнаванні на вайну ў Кітаі на 1938-39 г. складаюць 7,5 млрд. іен. Каб зразумець, як непасільны гэтыя расходы для слабой у эканамічных і фінансавых адносінах Японіі, трэба ўспомніць, што ўвесь нацыянальны даход Японіі ў 1936 г. ацэньваўся, па даных Лігі нацый, у 13 млрд. іен, а на 1939 г. японскі парламент зацвердзіў бюджэт у суме звыш 10 млрд. іен. Можна сабе ўявіць, якім цяжарам кладуцца на плечы працоўных Японіі выдаткі на вайну ў Кітаі, калі яны паглынаюць дзве трэці нацыянальнага даходу Японіі.

Каб выкалаціць з працоўных 7—8 млрд. іен на вайну ў Кітаі, японскі ўрад агаласіў лозунг — «эканоміць»

і ўведзены ў эксплаатацыю 356 новых прадпрыемстваў. Толькі на буйных прадпрыемствах Беларусі працуе 200 тыс. чалавек супроць 13 тысяч у 1913 г. Валавая прадукцыя ўсёй прамысловасці на тэрыторыі цяперашняй Беларусі ў 1913 г. складала ў пазменных цэнах 1926/27 го-

да 89 млн. руб., а ў 1937 годзе аб'ём валавой прадукцыі прамысловасці БССР склаў 2,15 млрд. руб. Валавая прадукцыя прамысловасці складае 77,5 проц. прадукцыі ўсёй народнай гаспадаркі рэспублікі.

Беларусь стала індустрыяльна-аграрнай рэспублікай з буйной прамысловасцю, з соцыялістычнай сельскай гаспадаркай.

Калі ў мінулым годзе па бюджэту на развіццё прамысловасці БССР было адпушчана 66.072 тыс. руб., то ў 1939 г. для прамысловасці Беларусі адпускаецца 78.635 тыс. руб. Гэта дасць нам магчымасць яшчэ больш умацаваць нашу пагранічную рэспубліку.

У выніку ажыццяўлення сталінскіх пяцігодак сельская гаспадарка Беларусі, як і ўсяго Совецкага Саюза, прадстаўляе сабой буйную механізаваную сельскую гаспадарку. Замест 838 тыс. аднаасобных сялянскіх гаспадарак з прымітыўнай тэхнікай, у Беларусі арганізавана 9.650 калгасаў, якія займаюць 97 проц. усёй пасеўнай плошчы рэспублікі.

У канцы другой пяцігодкі калгасы Беларусі абслугоўваліся 200 МТС. На палях працавала каля 9 тыс. трактараў, звыш 4 тыс. аўтамашын, звыш 1 тыс. камбайнаў і дзесяткі тысяч іншых складаных сельскагаспадарчых машын.

Уся гэта магутная тэхніка аказвае

аснашчэння соцыялістычнай сельскай гаспадаркі, арганізацыйна-гаспадарчага ўмацавання калгасаў і зробіць яшчэ больш эфектыўнай іх большэвіцкую барацьбу за павышэнне ўраджайнасці, за заможнае і культурнае жыццё калгаснікаў.

На соцыяльна-культурныя мерапрыемствы бюджэт БССР на 1939 г. прадугледжвае асігнаванне 907,6 млн. руб., што складае 70,3 проц. да ўсёй расходнай часткі бюджэта. У параўнанні з фактычным выкананнем 1938 г. рост гэтых асігнаванняў у 1939 г. складае 13,1 проц.

Дастаткова прывесці такія прыклады. Да рэволюцыі 75 проц. насельніцтва Беларусі было непісьменным. Жанчын было непісьменных 90 проц. Царскі ўрад на народную асвету ў 1914 г. расходваў каля 60 кап. на чалавека. Зараз у Беларусі расходуецца на народную асвету 116 руб. на чалавека.

Совецкая Беларусь — рэспубліка суцэльнай пісьменнасці. У рэспубліцы — 7.084 школы, у іх вучацца 1.184 тыс. дзяцей. Ёсць 22 ВНУ, у іх абучаюцца 15.540 студэнтаў, 97 тэхнікумаў з 33.300 студэнтаў. Толькі за другую пяцігодку ВНУ выпушчана 7.444 спецыялісты, тэхнікумамі — 29.678.

Такім чынам, за другую пяцігодку выпушчана цэлая армія соцыялістычнай совецкай інтэлігенцыі, актыўных будаўнікоў соцыялізма.

У дарэволюцыйнай Беларусі ў 1914 г. было зрасходвана 800 тыс. руб. на ахову здароўя, а ў 1939 г. па бюджэту БССР, не ўключаючы сродкаў мясцовага бюджэта, запраектавана зрасходваць на патрэбы аховы здароўя 73.204 тыс. руб.

Так, дзякуючы клопатам нашай партыі, совецкага ўрада і правадыра народаў таварыша Сталіна, з года ў год расце культура і матэрыяльны дабрабыт працоўных мас Совецкай Беларусі.

Наш совецкі бюджэт — бюджэт сапраўды народны, бо ён ствараецца рукамі народа, кантралюецца народам і выконваецца самім-жа народам. Совецкі народ цвёрда ведае, што кожная капейка, кожны совецкі рубель ідзе на працвітанне нашай вялікай соцыялістычнай радзімы, на справу будаўніцтва комунізма. І мнагамільённы совецкі народ, як адзін чалавек, прыкладзе ўсе намаганні к таму, каб наш дзяржаўны бюджэт быў выкананы дакладна і ў тэрмін. У гэтым сіла і перавага совецкага бюджэта.

Пераходжу да заўваг па бюджэту.

Першая заўвага: за апошні час у радзе саюзных рэспублік, у тым ліку і ў Беларусі, у парадку разбуйнення, створаны новыя раёны і наркаматы. Але сродкаў на ўтрыманне іх апарата не прадугледжана. Трэба ў гэтае пытанне ўнесці яснасць і вырашыць яго канчаткова.

Другая заўвага: у БССР выключна за-

водпуск неабходных сродкаў на пашырэнне энергетычнай гаспадаркі БССР.

Трэцяя заўвага: стан комунальнай гаспадаркі БССР, у прыватнасці жыллёвага фонда вельмі цяжкі. На стане жыллёвай гаспадаркі Беларусі асабліва моцна сказаліся імперыялістычная і грамадзянская войны. Праўда, толькі за другую пяцігодку ў жыллёвае будаўніцтва было ўкладзена 31,9 млн. руб., але гэта далёка не задавольвае патрэб рэспублікі. Мы просім дадаткова адпусціць на 1939 год 6—7 млн. руб. на жыллёвае будаўніцтва.

Чацвертая заўвага: сельскагаспадарчае мукамолле ў рэспубліцы знаходзіцца ў яўна нездавальняючым стане.

Мы просім павялічыць водпуск сродкаў для сельскагаспадарчага мукамолля на 1939 г. у размеры 7 млн. руб. Рост культурнага і матэрыяльнага дабрабыту калгаснікаў прад'яўляе павышаны попыт на хлебабулачныя вырабы. Існуючая база хлебапячэння не дазваляе даць патрабуемую колькасць гэтых вырабаў. На пашырэнне гэтай базы неабходна дадаткова адпусціць у 1939 г. 3 млн. руб.

Я прасіў-бы Трэцюю Сесію Вярхоўнага Совета пры канчатковым зацверджанні дзяржаўнага бюджэта на 1939 г. улічыць гэтыя заўвагі.

Таварышы дэпутаты! На гістарычным XVIII з'ездзе нашай партыі вялікі Сталін з прадзельнай яснасцю ўскрыў усю напружанасць і астрату міжнароднага становішча, паказаў нам усе пружыны капіталістычных супярэчнасцей, якія вядуць да падрыхтоўкі новай сусветнай вайны, да спробы ўцягнуць у гэтую вайну Совецкі Саюз.

У тым, што сярод акружаючых нас капіталістычных дзяржаў ёсць ахвотнікі, якія мараць паправіць свае худыя дзялішкі за кошт нашага совецкага дабра,— мы не сумняваемся. Што такіх глупых лятуценнікаў і фантазёраў за апошні час развялося нямала, сведчаць хоць-бы падзеі ля возера Хасан. Урок, прэпаданы нашаю слаўнаю Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміяй японскім самураям ля возера Хасан, ацвярозіў на некаторы час і моцна папярэдзіў не толькі японскіх самураяў, але і іншых фашысцкіх агрэсараў. Аднак, гэта не значыць яшчэ, што мы аднялі ў гэтых агрэсараў здольнасць марыць аб пажыве за наш кошт, аб падрыхтоўцы крыжовага паходу супроць нашага Совецкага Саюза. Каб прэсеч не толькі магчымасць арганізацыі крыжовых паходаў супроць СССР, але і магчымасць марыць аб такіх паходах, неабходна яшчэ вышэй падняць абароназдольнасць нашай радзімы, няспынна ўзнімаць баявую магутнасць нашай слаўнай Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі.

Кожнаму ясна, што калі да гэтага часу працоўныя Совецкага Саюза пазбеглі вайны, мірна працуюць, аддаючы сваю

не хочуць, жадаюць жыць мірна, а што з гэтага атрымалася? Далейшы лёс гэтых дзяржаў вам вядомы. Як бачыце, фашысцкія агрэсары груба парушаюць усякія нормы міжнароднага права і не лічацца ні з якімі міралюбівымі настроямі тых ці іншых дзяржаў. Яны лічацца толькі з сілай. Улічваючы гэта, наша партыя і наш урад, праводзячы цвёрдую палітыку міру, усямерна павышаюць баявую магутнасць нашай Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі. І самы важкі і моцны аргумент у барацьбе за мір — гэта несакрушымая магутнасць нашай Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі, якая, як паказалі ўжо хасанскія падзеі, дзейнічае ацвярозваюча на разгарачоныя галовы агрэсараў. Толькі за плячыма нашай магутнай Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі працоўныя Совецкага Саюза змогуць займацца мірнай працай на карысць і працвітанне нашай радзімы.

Умацаванне абароназдольнасці краіны і павышэнне боездольнасці Чырвонай Арміі звязаны з дадатковымі асігнаваннямі. І наша партыя, наш народ робяць усё, што ад іх залежыць, для ўзмацнення абароны краіны соцыялізма.

Паведамленне дакладчыка тав. Зверава аб тым, што з бюджэта ў 1939 г. на абарону краіны адпускаецца 40.885 млн. руб., было сустрэта намі, дэпутатамі, якія прадстаўляюць многамільённыя масы працоўных нашай краіны, з выключным задавальненнем і адабрэннем.

Беларускі народ разам з усімі народамі многанацыянальнага Совецкага Саюза аднадушна адабрае гэтыя мерапрыемствы ўрада СССР, бо яны накіраваны на ўмацаванне магутнасці і абароназдольнасці нашай радзімы. З пачуццем поўнага задавальнення і гордасці за нашу квітнеючую і шчаслівую радзіму, за ўрад Саюза ССР, узначальваемы Вячаславам Міхайлавічам Молатавым, сустрэне совецкі народ рашэнне Вярхоўнага Совета аб асігнаванні на абарону 40.885 млн. руб.

Галасуючы за зацвярджэнне дзяржаўнага бюджэта на 1939 г., галасуючы за бюджэтныя асігнаванні 40.885 млн. руб. на абарону краіны, мы палкам і поўнасцю выказваем гэтым самым волю нашых выбаршчыкаў, волю нашага вялікага совецкага народа. Няхай гэтыя цыфры прымусяць над сім-тым прызадумацца фашысцкіх агрэсараў. Няхай ведаюць японскія самураі, нямецкія і італьянскія фашысты, што ў выпадку нападу на СССР— увесь многамільярдны бюджэт нашай дзяржавы, уся воля нашага герайчнага совецкага народа будуць накіраваны да таго, каб поўнасцю разграміць і знішчыць ворага на яго-ж тэрыторыі.

Партыйныя і непартыйныя большэві-

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы